Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

27 КРАСАВІКА 2007 г. ПЯТНІЦА № 17 (15468)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

## ЗМЯНІЛІСЯ ГРАШОВЫЯ НОРМЫ РАСХОДАЎ НА ХАРЧАВАННЕ Ў АЗДАРАЎЛЕНЧЫХ ЛАГЕРАХ

**Згодна з адпаведнай пастановай Міністэрства адукацыі, у дзень у аздараўленчых лагерах дзённага знаходжання на харчаванне аднаго дзіцяці ва ўзросце 6—10 гадоў прадугледжана да 3820 рублёў, ад 11 да 13 гадоў — да 4270 руб, ад 14 да 18 — да 4600. У аздараўленчых лагерах кругласутачнага знаходжання на дзіця 6—10 гадоў павінна выдаткоўвацца да 4640 рублёў, 11—13 гадоў — да 5130, 14—18 — да 5490. У кругласутачных аздараўленчых лагерах, аздараўленчых лагерах кругласутачнага знаходжання абаронна-спартыўнага профілю, працы і адпачынку для дзяцей ва ўзросце 6—10 гадоў — да 5120, 11—13 — да 5670, 14—18 — да 5930.**

У пастанове сказана, што пры арганізацыі харчавання ў аздараўленчых лагерах дзённага знаходжання з выкарыстаннем датацый са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, а таксама за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія спецыялізуюцца на аказанні паслуг грамадскага харчавання, да грашовых нормаў расходаў на харчаванне прымяняецца павышаючы каэфіцыент 1,45.

Пры арганізацыі харчавання ўстановамі адукацыі ці аддзеламі (упраўленнямі) адукацыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у аздараўленчых лагерах дзённага знаходжання з выкарыстаннем датацый са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, а таксама за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, у сталоўках, якія з'яўляюцца структурнымі падраздзяленнямі ўстановы адукацыі і функцыянуюць на выплатнай аснове, да грашовых нормаў расходаў на харчаванне прымяняецца павышаючы каэфіцыент 1,3. Акрамя таго, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, зыходзячы з мясцовых умоў, могуць устанаўліваць канкрэтныя памеры грашовых нормаў на харчаванне дзяцей у аздараўленчых лагерах у межах грашовых нормаў расходаў на харчаванне, прыведзеных вышэй.

**Іна АРЭХАВА.**

Абітурыент-2007

# ВЫБРАЦЬ ЛЕПШЫХ З ЛЕПШЫХ — НЕ ПРАБЛЕМА...

## ...а што рабіць тым ВНУ, у каго намеціўся недабор?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**2 мая ў Беларусі распачнецца рэгістрацыя для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, а гэта азначае, што ў будучых абітурыентаў застаюцца лічаныя дні для таго, каб канчаткова вызначыцца з выбарам будучай прафесіі. Зразумела, што маючы на руках тры сертыфікаты, яны ўсё роўна да апошняга дня падачы дакументаў у прыёмную камісію будуць пралічваць свае шанцы на паступленне ў тую ці іншую ВНУ або на тую ці іншую спецыяльнасць, тым не менш карэнным чынам змяніць абраны прафесійны напрамак у іх наўрад ці атрымаецца. Гісторык не стане раптоўна біёлагам, а эканаміст — інжынерам, бо набор вучэбных дысцыплін пры паступленні на гэтыя спецыяльнасці ўсё ж такі адрозніваецца.**

**Цікава, што ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў (РІКВ), які з'яўляецца галоўным арганізатарам цэнтралізаванага тэсціравання, ужо валодаюць даволі падрабязнай інфармацыяй аб тым, па якому сцэнарыю будзе развівацца будучая прыёмная кампанія: на якіх спецыяльнасцях ці ў якіх ВНУ чакаецца «аншлаг», і наадварот, каму трэба паклапаціцца, каб завяваць увагу абітурыентаў. Днямі ў Мінску адбылася прэзентацыя рэспубліканскай інфармацыйнай базы даных «Прафпрагноз-2007», створанай сумеснымі намаганнямі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, абласных упраўленняў адукацыі, Мінскага гарадскога камітэта па адукацыі і рэгіянальных цэнтраў тэсціравання.**

— Мы выступілі ініцыятарамі гэтай акцыі, але без дапамогі педагогаў на месцах, без нашых рэгіянальных цэнтраў тэсціравання нам бы не ўдалося дайсці літаральна да кожнага выпускніка, — **паведаміў дырэктар РІКВ Мікалай Фяськоў.** — Больш за тое, створаная база даных змяшчае інфармацыю аб прафарыентацыйных намерах не толькі адзінаццацікласнікаў, але і цяперашніх дзесяцікласнікаў. Адразу скажу, што каля 80 тысяч выпускнікоў 2007 года заявілі аб сваім жаданні навучацца ў беларускіх ВНУ (усяго агульная сярэдняя школа выпускае сёлета каля 92 тысяч чалавек). А ёсць жа яшчэ і выпускнікі папярэдніх гадоў, якія таксама збіраюцца паступаць у ВНУ, выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, а таксама студэнты, якія ўжо атрымліваюць вышэйшую адукацыю на платнай форме навучання і будуць спрабаваць перапаступіць на «бюджэт». Такім чынам, конкурс абяцае быць не ніжэйшым, чым летась.

Перш чым заявіць аб сваіх прафесійных намерах, школьнікі вывучалі поўны пералік спецыяльнасцяў (357) і спецыялізацый (больш як 1 тыс.), па якіх вядзецца падрыхтоўка ў беларускіх ВНУ. Дарэчы, аб існаванні многіх спецыяльнасцяў будучыя абітурыенты даведаліся ўпершыню. Найбольшы інтарэс у маладых людзей выклікалі спецыяльнасці Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, а таксама БНТУ.

У лідарах па колькасці прэтэндэнтаў (1968 чалавек) аказалася спецыяльнасць «Правазнаўства. Аператыўна-вышуковая дзейнасць» Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў. Не выключана, што сённяшняя моладзь знаходзіцца пад магутным уплывам шматлікіх міліцэйскіх серыялаў... Вывучаць «лячэбную справу» ў БДМУ мараць 1813 чалавек. Наўрад ці кагосьці здзівіць інтарэс моладзі да эканамічных спецыяльнасцяў ці правазнаўства. Але на піку папулярнасці знаходзяцца таксама «матэматыка» (навукова-педагагічная дзейнасць) і «прыкладная матэматыка» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце — адпаведна 1741 і 1105 чалавек. Гэта тым больш дзіўна, што ахвотнікаў займацца Web-праграмаваннем і Інтэрнэт-тэхналогіямі ў БДУ прыкладна ў тры разы менш. Да своеасаблівых сюрпрызаў можна аднесці таксама павышаны інтарэс маладых людзей да спецыяльнасці «гідрапнеўмасістэмы мабільных і тэхналагічных машын» у БНТУ (1042 прэтэндэнтаў) і спецыяльнасці «тэхнічнае забеспячэнне працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці» ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце (812 прэтэндэнтаў). Спецыялізацыя «музыказнаўства» ў Акадэміі музыкі зацікавіла аж 959 чалавек. Між іншым, ахвотных стаць акцёрамі тэатра і кіно сярод выпускнікоў аказалася менш — аб сваёй акцёрскай будучыні заявілі «толькі» 830 чалавек.

**У 2006 годзе сярэдні конкурс на дзённую форму навучання ў ВНУ склаў 2,6 чалавека на адно бюджэтнае месца. Самы высокі конкурс быў зарэгістраваны ў Камандна-інжынерным інстытуце МНС (7 чалавек на адно месца), у Гомельскім інжынерным інстытуце МНС (5,6), Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (5,1) і ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (5,1 чалавека на месца).**

**Самы нізкі сярэдні конкурс быў зарэгістраваны ў БДАТУ (1,8 чалавека), Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце (1,6) і Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі (1,6)**

**Самы высокі прахадны бал па стобальнай шкале адзначаны ў 2006 годзе на спецыяльнасцях: «Сусветная эканоміка» (БДУ) — 357, «Лінгвакраіназнаўства» (БДУ) — 342 для гараджан і 329 для выпускнікоў сельскіх навучальных устаноў, «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (БДЭУ і МДЛУ) — адпаведна 336 і 334 балы, і «Мытная справа» (БДУ) — 333 для гараджан і 268 — для вяскоўцаў.**

З іншага боку, на многія спецыяльнасці пакуль што набіраецца з выпускнікоў менш чым па 20 прэтэндэнтаў. Прычым не толькі на спецыяльнасці прыватных вышэйшых навучальных устаноў. Увогуле рабіць нейкія прагнозы аб конкурсах у прыватныя ВНУ вельмі праблематычна, паколькі ў першую чаргу многія нацэленыя паступіць на бюджэтную форму навучання ў дзяржаўныя ВНУ, а прыватныя ВНУ з'яўляюцца «запасным аэрадромам». Са спецыяльнасцяў дзяржаўных ВНУ абітурыентам здаюцца неперспектыўнымі ў БНТУ — «суднабудаванне і эксплуатацыя ўнутранага воднага транспарту», «вакуумная і кампрэсарная тэхніка» і «водагаспадарчае будаўніцтва». У Полацкім дзяржаўным універсітэце — «прамысловая электроніка», «абсталяванне і тэхналогіі зварачнай вытворчасці», «абсталяванне і тэхналогіі высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялу». У Брэсцкім дзяржаўным універсітэце — «беларуская мова і літаратура плюс польская мова», «руская мова і літаратура плюс украінская мова», «гісторыя плюс англійская мова», «пачатковая адукацыя плюс музычнае мастацтва». Праблемы з конкурсам могуць быць таксама на многіх спецыяльнасцях Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі.

— Ва ўсіх вышэйшых навучальных установах (і дзяржаўных, і прыватных) ёсць магчымасць да пачатку прыёмнай кампаніі ацаніць колькасць прэтэндэнтаў і магчымы конкурс і, пакуль яшчэ застаецца пэўны час, прыняць адпаведныя меры па прыцягненню абітурыентаў на тыя факультэты і спецыяльнасці, дзе чакаецца невысокі конкурс ці ўвогуле недабор, — падкрэсліў Мікалай Фяськоў. — З уласнага жыццёвага вопыту хачу сказаць, што калі ў навучальнай установе з'яўляецца прадстаўнік ВНУ, для многіх маладых людзей гэта акалічнасць можа аказацца лёсавырашальнай, бо матывы выбару будучай прафесіі могуць быць самыя розныя: далёка не ўсе мэтанакіравана рыхтуюцца для паступлення на канкрэтную спецыяльнасць, хтосьці ідзе паступаць «па слядах» суседа па вёсцы ці старэйшага брата, а хтосьці можа прыняць рашэнне пасля грунтоўнай размовы з прадстаўніком той ці іншай прафесіі. Вырашальным фактарам можа стаць нават магчымасць атрымання месца ў студэнцкім інтэрнаце.

Усе вышэйшыя навучальныя ўстановы і органы кіравання адукацыяй атрымаюць базу даных «Прафпрагноз-2007» у электронным варыянце (гэта каля 6 тысяч старонак). Такім чынам, у спецыялістаў органаў кіравання будзе багаты матэрыял для таго, каб можна было планаваць мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў і рабіць высновы аб якасці прафарыентацыйнай работы ў кожнай канкрэтнай навучальнай установе. Зрэз інфармацыі можна зрабіць па самых розных напрамках: для прыкладу, на якія ВНУ нацэленыя выпускнікі школ Заводскага раёна сталіцы ці з якіх рэгіёнаў прыедуць абітурыенты паступаць у Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Рэктары тэхнічных ВНУ могуць пацікавіцца конкурсамі на аналагічныя спецыяльнасці ў сваіх непасрэдных канкурэнтаў. Скажам, колькі абітурыентаў хочуць паступаць на факультэт машынабудавання ў Мінску, Брэсце і Гомелі?

Інфармацыя збіралася з канца студзеня па сакавік, таму, зразумела, нейкія адхіленні ў лічбах будуць, але не вельмі істотныя. Мікалай Фяськоў не выключае, што ў будучыні прафпрагнозам будуць ахопленыя таксама выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Сёлета была зроблена толькі першая спроба, якая дасць багатую глебу для роздуму як кіраўнікам ВНУ, так і педагогам. Прафарыентацыйная работа з абітурыентамі — гэта не пусты гук і конкурсы на тую ці іншую спецыяльнасць — не заўсёды выпадковасць. У сярэдзіне 90-х гадоў тэхнічныя спецыяльнасці, напрыклад, мала цікавалі маладых людзей. Але сёння конкурсы ў БНТУ — вельмі высокія. «Рост конкурсаў на тэхнічныя і радыётэхнічныя спецыяльнасці сведчыць аб тым, што эканоміка інтэнсіўна развіваецца і нашай краіне патрэбныя не толькі гуманітарыі», — лічыць Мікалай Фяськоў. З іншага боку, і ВНУ павінны больш актыўна аб сабе заяўляць, нават сябе рэкламаваць, шукаць будучых сваіх студэнтаў яшчэ ў школьных сценах і мэтанакіравана іх рыхтаваць да паступлення. Інакш могуць паўтарыцца мінулагоднія праблемы. У 2006 годзе ўпершыню за многія гады па 13 спецыяльнасцях у шасці ўніверсітэтах аказаліся незапоўненыя 75 бюджэтных месцаў. З недаборам сутыкнуліся БДУ, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, Мазырскі, Баранавіцкі, Гродзенскі і Магілёўскі дзяржаўныя ўніверсітэты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

| Спецыяльнасць | Форма навучання | Колькасць прэтэндэнтаў |
|---|---|---|
| Лячэбная справа | дзённая | 1813 |
| Медыка-прафілактычная справа | дзённая | 571 |
| Стаматалогія | дзённая | 713 |
| Педыятрыя | дзённая | 632 |
| Ваенна-медыцынская справа | дзённая | 618 |

### САМЫЯ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Вышэйшая навучальная ўстанова | Спецыяльнасць | Колькасць прэтэндэнтаў |
|---|---|---|
| Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь | Правазнаўства. Аператыўна-вышуковая дзейнасць | 1968 |
| Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | Лячэбная справа | 1813 |
| Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь | Дзяржаўнае кіраванне і права | 1792 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | Матэматыка (навукова-педагагічная дзейнасць) | 1747 |
| Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве | 1256 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | Прыкладная матэматыка | 1105 |
| Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт | Гідрапнеўмасістэмы мабільных і тэхналагічных машын | 1042 |
| Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь | Правазнаўства. Судова-пракурорска-следчая дзейнасць | 1013 |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі | Мастацтвазнаўства (музыказнаўства) | 959 |
| Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь | Правазнаўства. Судовая экспертыза | 948 |
| Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | Лячэбная справа | 877 |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў | Акцёрскае майстэрства драматычнага тэатра і кіно | 830 |
| Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт | Фінансы і крэдыт | 821 |
| Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | Лячэбная справа | 821 |
| Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь | Кіраванне падраздзяленнямі мотастралковых войскаў | 813 |
| Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт | Тэхнічнае забеспячэнне працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці | 812 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | Эканамічная кібернетыка | 808 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | Правазнаўства | 793 |
| Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь | Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка | 778 |
| Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт | Маркетынг | 723 |
| Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | Стаматалогія | 713 |
| Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | Лячэбная справа | 699 |
| Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | Педыятрыя | 632 |
| Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь | Тылавое забеспячэнне войскаў (забеспячэнне гаручым) | 623 |
| Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | Ваенна-медыцынская справа | 618 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | Матэматыка (навукова-вытворчая дзейнасць) | 594 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | Матэматыка (Web-праграмаванне і Інтэрнэт-тэхналогіі) | 572 |

# НІХАУ, ДЗЯРЖЫНСК!

## Кітайская мова «рушыла» ў райцэнтры

**Сфера адукацыі апошнім часам развіваецца вельмі імкліва. Магу параўноўваць, паколькі вучыўся ў школе ў 1980-е і, напрыклад, з інфармацыйнымі тэхналогіямі на груваcткіх камп'ютарах пачаў знаёміцца толькі ў дзесятым класе. А мая дзевяцігадовая дачка з электроннай тэхнікай «на ты». Вось што значыць прагрэс!**

Школа імкнецца адаптавацца да асяроддзя, якое вельмі імкліва змяняецца, і адпаведным чынам падрыхтаваць да гэтага дзяцей. Нездарма ўсё часцей прыходзіцца чуць: адукацыя — не на ўсё жыццё, а праз жыццё. Значыць,трэба ўвесь час удасканальваць свае веды. Пры гэтым вельмі важна які «падмурак» быў закладзены яшчэ ў школе. Бо, як вядома, перамога пачынаецца ўжо на старце.

Калі раней у якасці лідараў па ўзроўню і якасці навучання ў большасці ўзгадваўся толькі Мінск, то зараз шэраг рэгіёнаў на роўных спаборнічае са сталіцай. У цэнтральнай вобласці развіццю адукацыі надаецца вялікая ўвага: удасканальваецца матэрыяльна-тэхнічная база (чаго варты сапраўдны «прарыў» у інфармацыйных тэхналогіях — зараз усе школыМіншчыны маюць сучасныя камп'ютарныя класы з усім неабходным наборам электроннай тэхнікі), павышаецца ўзровень выкладання прадметаў, укараняюцца сучасныя методыкі. Вынікі не прымусілі сябе чакаць — па шэрагу паказчыкаў сталічны рэгіён знаходзіцца ў лідарах. Прычым цікавая атрымліваецца рэч: на абласным узроўні на «першы план» выходзяць раёны, якія раней «прывычна» дасягалі не лепшых вынікаў. Напрыклад, калі на Дзяржыншчыне раней 2—3 вучні становіліся пераможцамі рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, то сёлета — ужо 12 школьнікаў. А ўсё чаму?

— Па ўдасканальванню сферы адукацыі праводзіцца вельмі вялікая работа, — кажа старшыня Дзяржынскага райвыканкама Мікалай Арцюшкевіч. — Мы адносім гэтае пытанне да разраду стратэгічных, узровень ведаў павінен адпавядаць запатрабаванням часу. Нездарма ж, напэўна, па выніках мінулага года раён у галіне адукацыі заняў першае месца. Гэта заслужаная адзнака агульнай працы, якую мы імкнёмся апраўдаць.

Зараз на Дзяржыншчыне працуе больш чым 60 устаноў адукацыі, на вёсцы створаны 9 вучэбна-педагагічных комплексаў. Акрамя гэтага, ёсць шэраг пазашкольных арганізацый: вялікая ДЮСШ, 2 цэнтры дзіцячай творчасці, цэнтр юных натуралістаў і інш. Карацей кажучы, і ў вольны час кожны можа знайсці сабе занятак па інтарэсах. У Дзяржынскім раёне зараз 7,4 тысячы школьнікаў і больш чым 2 тыс. выхаванцаў дзіцячых садкоў — даволі вялікая колькасць.

— Галоўная наша задача — прывесці да поспеху дзяцей, — лічыць начальнік аддзела адукацыі Дзяржынскага райвыканкама Вацлаў Матусевіч, — таму вялікая ўвага надаецца менавіта іх інтэлектуальнаму развіццю. Імкнёмся забяспечыць павышаны ўзровень навучання, удасканальваць якасць адукацыі. Педагагічны калектыў на належным узроўні — каля 90 працэнтаў настаўнікаў маюць вышэйшую адукацыю. З кадрамі ў нас праблем не ўзнікае, паколькі штогод у вышэйшыя навучальныя ўстановы па педагагічнаму профілю паступае каля 60 выпускнікоў школ. Аднак з'яўляецца надзённае пытанне — недахоп спецыялістаў у іншых галінах, напрыклад, сельскагаспадарчай. Каб забяспечыць гэтую патрэбу, трэба сур'ёзна працаваць. Але лепшыя вучні ўсё ж такі імкнуцца застацца ў сталіцы.

У сярэдніх школах створаны 12 ліцэйскіх класаў. Больш чым 80 працэнтаў школьнікаў Дзяржынскага раёна вывучаюць прадметы на паглыбленым узроўні. Як тут лічаць, у дзяцей заўсёды ёсць такое права, а настаўнік павінен развіваць здольнасці сваіх выхаванцаў. Павышаны ўзровень адукацыі, заўважае Вацлаў Матусевіч, трэба ўспрымаць і як павышаны ўзровень абавязкаў педагагічнага калектыву, дырэкцыі да навучання і выхавання. Дзяржыншчына адметная яшчэ і тым, што тут працуюць адразу тры гімназіі: дзве — у раённым цэнтры і адна — у Фаніпалі. Узровень ведаў, якія тут атрымліваюць вучні, вельмі высокі, — у гэтым пераканаўся на ўласныя вочы, калі завітаў у госці да гімназістаў.

Падстаў было некалькі: па-першае, ужо зараз пяцёра вучняў выпускнога класа адной з устаноў могуць лічыць сябе студэнтамі ВНУ, паколькі сталі пераможцамі рэспубліканскіх прадметных алімпіяд. Па-другое, упершыню на ўзроўні райцэнтра тут пачалі выкладаць кітайскую мову. Усё гэта — пра Дзяржынскую гімназію. Створана яна была амаль шаснаццаць гадоў таму, у 1991-м. Спачатку выкладанне ў гімназіі вялося выключна на беларускай мове, зараз прысутнічае і руская.

— Выкладанне ў пачатковых класах вядзецца толькі на беларускай мове, — адзначае дырэктар Дзяржынскай гімназіі Міхаіл Доўнар, — а ў старэйшых пэўная колькасць прадметаў — на рускай. Так пажадалі бацькі. Тым не менш, большасць нашых дзяцей у якасці прадмета па тэсціраванню выбіраюць менавіта родную мову і паспяхова праходзяць іспыты. Вось такая цікавая дэталь.

У гімназіі вучні могуць паглыблена займацца па шэрагу прадметаў (матэматыцы, фізіцы, хіміі, інфарматыцы і інш.), актыўна карыстаюцца такім сваім правам і дасягаюць выдатных вынікаў. Максім Барысаў вучыцца ў адзінаццатым класе, як узгадвае хлопец, інфарматыкай зацікавіўся яшчэ ў шостым, калі з'явіўся камп'ютар. Ужо тады ён цвёрда вызначыўся, кім хоча стаць, і ўпарта ішоў да пастаўленай мэты. Сёлета ўдзельнічаў у рэспубліканскай прадметнай алімпіядзе па інфарматыцы, дзе стаў адным з пераможцаў. Па правілах, Максім без экзаменаў можа паступаць у ВНУ адпаведнага профілю. Гэта значыць, што ён фактычна стаў першакурснікам — варта толькі дакументы падаць. Максім ужо вызначыўся: плануе вучыцца на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Марыць стаць праграмістам і, напэўна ж, стане — з яго здольнасцямі.

Яшчэ чацвёра аднакласнікаў Барысава перамаглі на рэспубліканскай алімпіядзе: па гісторыі, хіміі і двое — па англійскай мове. Дарэчы, лінгвістычны накірунак у Дзяржынскай гімназіі вельмі моцны. Англійскую мову на паглыбленым узроўні тут вывучаюць, пачынаючы з першага класа. Дырэктар расказваў, што нядаўна ў раён прыязджала замежная дэлегацыя, патрабаваўся перакладчык. У гэтай якасці выступілі вучні гімназіі, яны выдатна размаўлялі па-англійску і госці пацікавіліся, ці жылі гімназісты за мяжой. Калі тыя адказалі, што не жылі, то іншаземцы моцна здзівіліся, нават спачатку не паверылі — падумалі, дзеці жартуюць. Разам з англійскай у гімназіі можна дадаткова вывучаць французскую, нямецкую, польскую мовы. Настаўнікі сапраўдныя прафесіяналы — напрыклад, польскую выкладае выпускніца Беластоцкага ўніверсітэта (дарэчы, у свой час яна скончыла Дзяржынскую гімназію). Па суботах праводзіцца факультатыў па кітайскай мове.

— Трэба дакладна разумець: тых, хто ведае англійскую мову зараз шмат, нікога такім веданнем не здзівіш, — адзначае Міхаіл Доўнар. — Англійская мова па шэрагу спецыяльнасцяў патрэбна проста для работы. А вось веданне кітайскай мовы ўжо само па сабе можа быць прафесіяй. Калі да гэтага яшчэ дадаць добрую адукацыйную базу, то ёсць рэальная магчымасць знайсці перспектыўнае месца работы. Выпускнікі будуць запатрабаванымі на рынку працы, у іх будзе выбар. Так што за кітайскай мовай вялікая будучыня.




Даволі «экзатычны» факультатыў пачаў працаваць у Дзяржынску ў межах спецыяльнага пагаднення, якое было падпісана паміж Мінсітэрствам адукацыі Беларусі і Дзяржаўнай канцылярыяй КНР. Зараз кітайскую мову вывучаюць 18 гімназістаў — з 5, 6, 7 і нават 10 класаў. Выкладчык кожны тыдзень па суботах прыязджае з Мінска. Дзеці ўжо ведаюць 200 іерогліфаў і могуць весці простыя дыялогі. Усім вельмі падабаецца. Асобныя акрамя кітайскай вывучаюць яшчэ некалькі замежных моў. Дзесяцікласніца Насця Юшкевіч разумее, што не паспее ў поўнай ступені авалодаць 1,8 тысячы неабходнымі іерогліфамі (усяго ж «літар», як казала дзяўчына, каля 40 тыс.), але важна пачаць займацца. Насця марыць калі-небудзь патрапіць у Кітай: «буду разумець, аб чым там людзі размаўляюць, сама з імі гутарыць». Прынамсі, вітацца дзеці навучыліся ўжо зараз — па-кітайску гэта гучыць як «ніхау». У далейшым яны ўсяму навучацца, а знаёмства з гэтай замежнай мовай працягнецца: як паведаміў Міхаіл Доўнар, з новага навучальнага года ў гімназіі кітайскі будуць вывучаць дзве групы, пачынаючы з першага класа. Так што сапраўды — ніхау, Дзяржынск.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Мінск—Дзяржынск—Мінск.*

## Моладзь — на ахову парадку

**Актывісты маладзёжных атрадаў аховы парадку Пастаўшчыны абмяняліся вопытам падчас спецыяльнага збору, арганізаванага райкамам БРСМ. Абмяркоўвалі тэму індывідуальнай працы з цяжкімі падлеткамі. Практыка паказвае, што апошнія добра перавыхоўваюцца, калі займацца іх лёсам «не для галачкі», а праяўляць да іх жыцця сапраўдны інтарэс, без фармалізму.**

Цяжкія падлеткі разам са старэйшымі таварышамі з БРСМ займаюцца ў розных спартыўных секцыях, для іх арганізуюцца валанцёрскія і іншыя атрады, праводзяць розныя цікавыя конкурсы і віктарыны. Паралельна вядзецца работа і з бацькамі, на жаль, не менш «цяжкімі», чым іх дзеці. У гэтым накірунку працуюць спецыяльна створаныя камісіі з прадстаўнікоў розных ведамстваў і мясцовых уладаў.

БРСМ сёлета значна пашырае работу ў накірунку прафілактыкі правапарушэнняў, штодзень выходзяць на дзяжурства сотні членаў БРСМ, якія сочаць за парадкам на вуліцах, дыскатэках, іншых мерапрыемствах. Як канстатуюць кіраўнікі праваахоўных органаў, такія атрады моладзі вельмі эфектыўна працуюць у сельскай мясцовасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У МІНСКУ НА АРГАНІЗАЦЫЮ ЛЕТАМ ДРУГАСНАЙ ЗАНЯТАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ ПЛАНУЕЦЦА ВЫДЗЕЛІЦЬ 1,5 МЛРД. РУБЛЁЎ

**Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Уладзімір Шчэрба.**

Паводле яго слоў, на працягу апошніх трох гадоў аб'ём сродкаў, выдзеленых з дзяржаўнага фонду садзейнічання занятасці насельніцтва на арганізацыю другаснай занятасці, вырас амаль у 3 разы, з мясцовага бюджэту — у 1,5 раза. «Сродкі, выдзеленыя на арганізацыю часовай занятасці моладзі ў свабодны ад навучання час, штогод асвойваюцца ў поўным аб'ёме», — падкрэсліў субяседнік. Гэтым летам будзе арганізавана грамадска-карысная праца 26,5 тыс. навучэнцаў школ і прафтэхвучылішчаў. Яны будуць працаваць у 935 рамонтных брыгадах, атрадах па добраўпарадкаванню і азеляненню. Індывідуальна будзе працаўладкавана 18 тыс. падлеткаў, з якіх 8,4 тыс. — за кошт сродкаў другаснай занятасці, сказаў кіраўнік камітэта.

У мінулым годзе ў працоўных аб'яднаннях працавалі амаль 3,5 тыс. падлеткаў. Акрамя таго, больш як 16,5 тыс. навучэнцаў былі працаўладкаваны індывідуальна. Найбольш актыўна такую форму занятасці выкарысталі навучэнцы прафесійна-тэхнічных каледжаў гандлю, швейнай вытворчасці і іншыя.

Муз-news

## «МУЗЫЧНАЯ» БЯЛІЗНА ЎСІХ ПАМЕРАЎ

Галіна Шышкова двойчы парадавала прыхільнікаў — выхадам новага альбому «Я буду чакаць цябе» (і вялікім канцэртам у яго падтрымку) і паведамленнем аб тым, што сумесна з сяброўкай Аленай Грышанавай будзе выпускаць калекцыю жаночай бялізны пад правакацыйнай назвай «Грашыш?».

Альбом «Я буду чакаць цябе» з новымі хітамі і 2 відэакліпамі можна набыць ужо зараз, а відэаверсію канцэрта — паглядзець на канале СТБ 1 мая. У праграму, дарэчы, трапілі не толькі сольныя знаходкі Галіны Шышковай, але таксама дуэты — з Аленай Грышанавай, Георгіем Калдуном, цыганскім шоў «Алюр», — і ўпрыгожаны варыянт украінскай песні «Лелекі», якую ў дзяцінстве спявачка чула ад дзядулі.

Наконт лініі бялізны — назву яе спявачкі прыдумалі, склаўшы часткі сваіх прозвішчаў. У хуткім часе яны абяцаюць прадумаць і паўсядзённы, і «парадны» варыянты спакуслівых жаночых рэчаў. Акрамя таго, Галіна задумала стварыць і ўласную лінію адзення.

## ЗА ЎСЁ ДАРАЖЭЙ

У другі раз спявак Аляксандр Патліс ініцыіраваў дабрачынны музычны праект «Я буду жыць». Канцэрт з такой назвай прайшоў 20 красавіка ў КЗ «Мінск». Удзел у ім узялі сябры і калегі па сцэне — Іскуі Абалян, Пётр Елфімаў, Іна Афанасьева, Аляксандр Ціхановіч, Алеся, Віктар Пшанічны, Ірына Дарафеева, Аляксей Хлястоў, Алена Валошына, Настасся Ключнік, Ксюша Сітнік, маладзёжны гурт «K+FA», калектывы «Тяни-Толкай», «Corpen Diaz» і «Martin». Увесь прыбытак ад выступлення будзе накіраваны на пакупку медыкаментаў і вітамінаў для дзяцей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі.

Патліс не змяніў свайму прынцыпу — дабрачыннасць павінна быць адраснай, з канкрэтнымі імёнамі. Як сродкі ад першага канцэрта «Я буду жыць» былі падзелены паміж 5 хворымі дзецьмі (на кожнага прыпала па 600 долараў у эквіваленце), так і выручаныя зараз грошы дапамогуць 5 дзецям: Валерыі Талкачовай (2001 г.н., г. Бабруйск), Ані Клопат (1995 гн., г. Брэст), Дзіму Кулiку (2005 г.н., г. Віцебск), Валерыі Фаміной (2006 г.н., г. Магілёў) і Андрэю Рабаму (1990 г.н., г. Брэст).

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Загадкі гісторыі

# СТАРАЖЫТНЫЯ БЕЛАРУСЫ ПАДЫМАЛІ ДЗЕСЯЦІТОННЫЯ ВАЛУНЫ...



**Героі і авантурысты, шпіёны і чараўнікі ўсіх рангаў прыцягваюць нашу ўвагу пастаянна. Людзей зачароўвае пачуццё таемнасці — менавіта таму мы так настойліва намагаемся прыўзняць заслону над невядомым. Розныя ёсць занятКі, якія дапамагаюць даведацца аб нечым новым, цікавым і непаўторным. У кожнай таямнічай рэчы ёсць свая гісторыя, якую мы хацелі б ведаць. А каб дапамагчы нам у гэтым, на свеце жывуць людзі, чый характар вызначыў іх далейшы лёс. Яны, безумоўна, героі, ёсць у іх нешта ад шпіёнаў, а тое, што яны сапраўдныя чараўнікі — сумненняў і наогул няма. Яны заўсёды будуць ведаць больш, чым мы. Таму што яны — археолагі.**

*І хачу адразу ж папрасіць прабачэння за тое, што памыліўся ў прагнозах. Калі накіроўваўся на сустрэчу ў старажытны Полацк да* ***вядомага беларускага археолага Дзяніса ДУКА, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, загадчыка кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта,*** *то не чакаў ад сустрэчы нічога звышнатуральнага. Аднак, як высветлілася, пра навакольны свет мы ведаем толькі тое, што ўжо даследавалі вучоныя. А загадак, якія пакуль застаюцца неразгаданымі, яшчэ шмат. Вельмі шмат! І археалогія дапамагае знайсці адказы на пытанні «адкуль?», «хто?», «чаму?».*

*Мы ведалі, напрыклад, што гарадскі пасёлак Асвея, які знаходзіцца ў Верхнядзвінскім раёне, не 500 гадоў, як меркавалі раней. Асвея, як высветлілася, заснавана не менш чым тысячагоддзе таму. Не так даўно, калі святкавалі юбілей гэтага месца, полацкія археолагі здабылі ўнікальныя матэрыялы — былі знойдзены доказы таго, што яна была заснавана не ў XVI стагоддзі, а значна раней — у Х.*

***— Няўжо ў Полацку трэба яшчэ праводзіць раскопкі? Здаецца, гэтаму гораду гісторыкі ўдзялілі найбольшую ўвагу, што яшчэ ўнікальнага можна здабыць?***

— Прывяду толькі адзін прыклад — у 2004 годзе мы раскапалі невядомую дагэтуль частку горада плошчай у 21 гектар. Каб уявіць, шмат гэта ці не, скажу, што ў старажытнасці нават не ўсе гарады мелі такія памеры. Пры тым, што даскапала даследаваць мы змаглі толькі 350 квадратных метраў плошчы старажытнага паселішча. Раскопвалі па 150 «квадратаў» у год, і гэта, я вам скажу, для археолагаў вельмі добрыя тэмпы. А колькі трэба часу, каб даследаваць усю плошчу знойдзенай часткі старажытнага Полацка? Акрамя таго, застаюцца іншыя мясціны ў горадзе, дзе археалагічныя работы нават не пачыналіся...

***— І аб чым вы даведаліся?***

— У знойдзенай частцы горада жылі купцы, рамеснікі, у асноўным заможны люд. Каля берага меўся прычал, у які заходзілі замежныя гандлёвыя караблі. Важным адкрыццём з'явілася і тое, што вакол гэтага месца былі ўзведзены абарончыя збудаванні. Знойдзены сляды бітваў, і гэта дазваляе меркаваць аб тым, што рамеснікі абаранялі свой дом. Паводле ранейшых жа думках гісторыкаў, рамеснікі і купцы не ўдзельнічалі ў ваенных канфліктах. Абарончая сцяна, якая цягнулася ўздоўж усяго месца, таксама з'яўляецца карысцай знаходкай. Справа ў тым, што ў тыя часы ўмацоўваліся ў асноўным толькі замкі, аднак мы ўбачылі — Полацк быў падрыхтаваны да абароны не толькі ў тым месцы, дзе жылі князі. У старажытнай частцы быў знойдзены каштоўны пярсцёнак і жаночыя ўпрыгажэнні. Па ўсім відаць, што там жыў і багаты ювелір.

***— Дзе яшчэ праводзіліся раскопкі ў Полацкім раёне?***

— Мы шукалі адказ, ці сапраўды каля Полацка знаходзіцца родавы склеп віцэ-адмірала рускага флоту Іларыёна Афанасьевіча Павалішына. Як гістарычная фігура ён стаіць на адной прыступцы з такімі асобамі, як, напрыклад, адмірал Ушакоў. Дастаткова сказаць, што ў Эрмітажы выстаўлена падараваная яму Кацярынай II шпага, аздобленая дыяментамі. У вёсцы Янкавічы знаходзіўся маёнтак, які належаў роду Іларыёна Павалішына. Хадзілі чуткі аб тым, што ён пахаваны ў гэтых мясцінах.

***— Знайшлі?***

— Так, мы знайшлі склеп. На жаль, ён пацярпеў ад вандалаў, яны не пашкадавалі нават цела віцэ-адмірала. Але нам удалося знайсці фрагменты пліты і скласці яе кавалкі так, што можна было разглядзець высечаныя на ёй гады нараджэння і смерці Павалішына. Мы нават выявілі, што ў далейшым у склепе знайшлі вечны прытулак нашчадкі віцэ-адмірала. Мясцовая ўлада абяцала дапамагчы, зараз пачынаюцца работы па ўсталяванню на гэтым месцы каплічкі, плануюць, што яно ператворыцца ў турыстычны аб'ект. Дарэчы, насуперак меркаванням аб «злых уладарах», у сялян засталася добрая памяць пра яго. І дзеці славутага чалавека таксама не крыўдзілі сваіх людзей, простаму чалавеку жылося пад уладарствам паноў Павалішыных добра. Гаспадары гэтых мясцін заснавалі школу і парк, і да цяперашняга часу мясцовыя вучні ходзяць у школу, якая носіць імя віцэ-адмірала Павалішына. Калі б ён быў дрэнным гаспадаром, народ не пранёс бы памяць праз стагоддзі.

*Але раскопкі праводзяцца не на любым месцы. Спецыяліст спачатку вывучае гістарычныя крыніцы, старажытныя карты і планы мясцовасці. А яшчэ трэба мець моцную інтуіцыю і крыху... рызыкі. Напрыклад, каля мястэчка Турджэц, або, як гістарычна больш правільна, Турэц, некалькі гадоў таму знайшлі старажытныя пахаванні. Прычым яны выглядалі так незвычайна, што версіі пасыпаліся адна за адной. «Вікінгі... Варагі... Прусы», — наўздагон паступалі прапановы. Запахла сенсацыяй. Калі ж археолагі ўзяліся за справу, то высветлілася, што ў незвычайных магілках ляжалі... простыя беларускія сяляне. Расчараваны былі многія. Але Дзяніс Уладзіміравіч, напрыклад, толькі ўзрадаваўся:*

— У магілках XVIII стагоддзя, а ў гэты час беларускі этнас ужо сфарміраваўся, мы здабылі цікавыя рэчы. Старажытныя сяляне, якія жылі ў раёне вёскі Турэц, не проста хавалі сваіх продкаў. Над месцам пахавання яны ўзводзілі драўляны дом, потым збіралі каменне і абкладвалі ім гэтае збудаванне. Па форме яно нагадвала ладдзю — менавіта таму некаторыя лічылі, што на гэтым месцы ляжаць варагі. І самае галоўнае, аналіз паказаў, што месцы пахавання сваіх продкаў людзі наведвалі на працягу двухсот гадоў. Мы знайшлі посуд, абломкі керамікі XVIII, XIX, XX стагоддзяў. Уявіце, як моцна беларусы шанавалі памяць прашчураў — яны, можа, ўжо і не памяталі, кім даводзіцца ім той, хто знайшоў тут вечны спакой, аднак працягвалі прыходзіць да яго, даглядалі магілкі, праводзілі памінальныя абрады. Камяні, якімі абкладзены пахаванні, важаць дзесяткі тон. Прычым абраду шанавання продкаў людзі прытрымліваліся нават і ў пачатку XX стагоддзя! Магчыма, толькі прыход савецкай улады спыніў традыцыю. На гэтым месцы мы знайшлі і пяць камянёў, якія людзі апрацавалі да формы хрысціянскіх крыжоў, якія, дарэчы, вельмі падобныя на знакаміты Тураўскі крыж. Калі разбіралі капішчы, то заўважылі, што вялікая частка камянёў мае і паганскія сімвалы.

***— Атрымліваецца, што вялізныя каменныя пахаванні ўзводзілі простыя сяляне...***

— Так, і я зайздрошчу моцы іх традыцый. Зараз на гэтых месцах знаходзяцца сучасныя могілкі, і можна заўважыць, што некаторыя нашы сучаснікі ставяцца да памяці сваіх продкаў са значна меншай павагай. Дарэчы, сяляне былі праваслаўнымі, а між тым маёнтак, да якога яны былі прызначаны, належаў да езуіцкага калегіума. Але гаспадары не рабілі з гэтага вялікай праблемы.

***— Вы адмыслова падкрэслілі, што этнас беларусаў да пачатку XVIII стагоддзя ўжо сфарміраваўся?***

— Я хачу сказаць, што ў магільніках былі пахаваны людзі, якія не зусім адпавядаюць сённяшнім уяўленням аб беларусах таго часу. Сяляне, якія займаліся цяжкай фізічнай працай усё жыццё, былі пахаваны ва ўзросце 40—60 гадоў, рост мужчын дасягаў 180 сантыметраў, і пры жыцці іх здароўе было моцным. Мы знайшлі жанчыну, якая памерла ва ўзросце за 60 гадоў. Яна мела рост за 170 сантыметраў і фізічныя параметры, якія можна суаднесці з параметрамі прыгажунь-мадэляў XXI стагоддзя. Антрапалагічны аналіз дазваляе сцвярджаць аб гэтым. Ёсць над чым паразважаць, таму што звычайныя нашы ўяўленні пра чалавека таго часу малююць вобраз невысокай і досыць хліпкай асобы. Мы, сучасныя людзі, і тое ўдзесяцярых ссоўвалі для правядзення аналізу адзін вялізны валун, які стаяў на месцы пахавання. А такіх камянёў там шмат, і іх прынёс тагачасны чалавек...

Увогуле, край гэты абвеяны паданнямі. Недалёка знаходзіцца «беларускі Стоўнхэдж» — каля ракі раскінуўся мегалітычны каменны комплекс эпохі бронзавага веку. Яму, магчыма, каля чатырох тысяч гадоў. Хто змог у пэўным, зададзеным парадку пакласці гіганцкія камяні і для чаго, невядома. Аднак можна здагадацца, што комплекс мае сувязь з гарой, якая знаходзіцца каля «беларускага Стоўнхэджа» з незабыўных часоў. Заўсёды месца гэтае з'яўлялася культавым, сакральным, і зараз тут адчуваецца нейкі магічны подых паветра. Што адбывалася каля «беларускага Стоўнхэджа», і якія абрады праводзіліся, археолагам яшчэ трэба высветліць.

*...Пасля такіх расказаў нават дрыжыкі па шкуры...*

***— А не страшна кранаць старажытныя магілкі, у якіх людзі спачылі стагоддзі таму? Хто ведае, якія могуць быць наступствы? Фільмы жахаў, напэўна, узгадвалі...***

— Шчыра кажучы, страшна, але трэба яшчэ паразважаць, навошта гэта робіцца. Калі дзеля бяздзейнай цікаўнасці, тады, канешне ж, гэта недапушчальна. Мы ж праводзім раскопкі дзеля таго, каб памяць аб чалавеку, які пахаваны, аднавілася зноў, і каб пра яго не забываліся сучаснікі. Мы не трывожым старажытных людзей. Антрапалагічная экспертыза праводзіцца адразу ж на месцы, мы маем благаслаўленне і дазвол царквы на работы, астанкі пасля экспертызы мы кладзём так, як яны і ляжалі. І хаваем чалавека паводле ўсіх хрысціянскіх традыцый. Таму жахі па начах не прыходзяць — дзякуючы нашай рабоце, мы аднавілі магільнікі, якія сучасныя людзі па няведанню маглі зраўняць з зямлёй.

***— Актуальная праблема «чорных» археолагаў? Ці праводзяцца ў Беларусі нелегальныя раскопкі дзеля пошуку каштоўнасцяў і іх продажу?***

— Нават калі археалогіяй займаюцца на аматарскім узроўні, з-за цікаўнасці да гісторыі, гэтага лепш не рабіць. Ёсць жудасныя прыклады разбурэння ўнікальных помнікаў гісторыі з-за непрафесійных паводзінаў. Што датычыцца «чорнай археалогіі», то скажу, што ў нашай краіне гэтая праблема сустракаецца, але з ёю можна змагацца. У суседніх дзяржавах, на жаль, «чорныя археолагі» ўжо нікога не здзіўляюць. У час раскопак нам дапамагаюць добраахвотнікі, сярод іх сустракаліся і сустракаюцца розныя людзі, але ў Полацку праводзіць нелегальныя раскопкі складана. За парадкам сочаць праваахоўныя органы. Ноччу капаць ніхто не будзе, а днём працуем мы.

***— А вам «чорныя» археолагі супрацоўнічаць не прапаноўвалі? Увогуле, куды трапляюць гістарычныя знаходкі?***

— Не, на маёй памяці такіх прапаноў не было. Спачатку, прыблізна на паўгода, знаходкі накіроўваюць на рэстаўрацыю ў Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. Потым яны могуць быць выстаўлены ў працуючай экспазіцыі музея-запаведніка, знаходкі могуць трапіць у іншыя музеі краіны. Знойдзеныя прадметы і рэчы знаходзяцца ў сховішчах пад надзейнай аховай.

***— Што трэба зрабіць, каб атрымаць дазвол на правядзенне раскопак?***

— Мець як мінімум прафесійную вышэйшую адукацыю. Акрамя таго, трэба атрымаць два дакументы — пасведчанне Міністэрства культуры аб тым, што чалавек мае права займацца археалогіяй прафесійна, і дазвол на правядзенне археалагічных работ. Яго выдае Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук. Дазвол можа быць рознай формы, у залежнасці ад складанасці даследавання. Пасля таго, як прайшоў год з часу атрымання дазволаў, трэба накіраваць у Акадэмію навук справаздачу аб зробленым. І калі праца задаволіць камісію сваёй якасцю, пры наяўнасці заявы на працяг работы зноў можна працягваць прафесійную археалагічную дзейнасць.

***— Дзе адбудуцца раскопкі гэтым летам?***

— У Полацку. Мы раскапалі толькі невялікі кавалак знойдзенай часткі горада, і таму работы хопіць. Хачу выказаць меркаванне аб тым, што ў бліжэйшы час трэба стварыць у Полацку пастаянна дзеючую экспедыцыю, як уНоўгарадзе. Гэта неабходна, таму што раскопкі, якія праводзяцца толькі ў летні час (і то не ўсе тры месяцы), не змогуць ахапіць усе неабходныя тэрыторыі. Тым больш, што ў Беларусі ёсць старажытныя месцы, дзе зусім не праводзіліся археалагічныя пошукі.

***— Працуеце пры дапамозе спецыяльнага пэндзля і рыдлёўкі?***

— Бывае і так, што бульдозерам даводзіцца капаць, усё залежыць ад асаблівасцяў месца і таго, што шукаеш.

*Раскопкі — справа спецыфічная. Трэба не толькі мець жаданне, але і вытрымку. Дзянісу Дуку пашанцавала — яго жонка падзяляе імкненні мужа, а праз некалькі гадоў падрасце сын і далучыцца да бацькоў.*

Калі мая жонка паехала гэтым летам са мной на раскопкі, яна сказала — супер! Што можа быць лепш за свежае паветра і нефармальныя зносіны з цікавымі людзьмі. Археалогія — гэта не захапленне, і нават не стыль жыцця. Гэта само жыццё, — лічыць Дзяніс Дук.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**
*Полацк—Мінск.*

## УШУ — гэта цікава!

**У апошнія гады сярод старадарожскіх хлопцаў і дзяўчат стаў папулярным цікавы від усходняга адзінаборства — ушу (саньшоў). І гэта з лёгкай рукі Сяргея Арлоўскага. Два апошнія гады перад вывадам савецкіх войск з Афганістана яму давялося выконваць інтэрнацыянальны абавязак. Служыў там старшым сяржантам, быў намеснікам камандзіра ўзвода. Займаўся з дапамогай службовага сабакі пошукам замежных мін на поўначы Афганістана.**

Пасля дэмабілізацыі прачытаў неяк у газеце аб'яву пра платныя курсы па ўшу, якія праводзяць в'етнамцы ў Мінску, і рашыў заняцца гэтым спартыўным майстэрствам. Даведаўся на курсах, што ўшу — гэта і аздараўленне, і спорт (як у выглядзе комплексу гімнастычных практыкаванняў, так і баявы, калі ажыццяўляецца непасрэдны баявы кантакт чалавека з чалавекам). Атрымаў там пасведчанне «сіні пояс» па стылю «ханзакуан». Іншымі словамі, Сяргей Арлоўскі мае права займацца трэнерскай дзейнасцю сярод дзяцей і дарослых.

І ўжо 7 гадоў трэніруе дзяцей: пачынаў у СШ № 4, а пазней стаў працаваць у ДзЮСШ аддзела па спорту і турызму Старадарожскага райвыканкама, дзе займаюцца тры групы: трэніруюцца хлопцы і дзяўчаты не толькі з райцэнтра. Шліфаваць сваё спартыўнае майстэрства сюды прыязджаюць дзеці з Горкаўскай і Крываносаўскай СШ.

Ёсць і поспехі. У лістападзе мінулага года ў гульнявой зале мясцовай ДзЮСШ адбыліся спаборніцтвы — Адкрыты кубак і першынство Мінскай вобласці па ўшу, дзе мясцовая каманда юніёраў выйшла пераможцай, а дарослая заняла трэцяе месца. Гэта тым больш прыемна, бо ўдзельнічалі ў спаборніцтве спарстмены не толькі Міншчыны, але і з Гродзенскай вобласці.

Трохгадовыя заняткі ўшу далі магчымасць адзінаццацікласніку Крываносаўскай СШ Артуру Баратаву стаць не толькі пераможцам у вобласці, але і прызёрам на рэспубліканскіх іспытах.

Былі пераможцамі на абласных спаборніцтвах Каця Амяльчэня і Яўген Брагінец з гарадской СШ № 2, упэўнена яны выступаюць і на рэспубліканскіх турнірах. Гэта не перашкаджае Яўгену яшчэ іграць на кларнеце. Так што і ўсходняе адзінаборства прыцягвае да сябе хлопцаў і дзяўчат, калі трэніруе іх улюбёны ў гэту справу чалавек...

**Анатоль БАРЫС.**

## ПАТРЭБНЫ НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

**У Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны сёлета будзе ажыццяўляцца прыём студэнтаў па новай спецыялізацыі: санветэкспертыза.**

Адрозненне ад звычайнага ветэрынара такога спецыяліста ў тым, што яго навучаць працаваць непасрэдна на прадпрыемствах мяса-малочнай прамысловасці, якіх у краіне налічваецца каля 400. Там цяпер працуюць больш 1000 урачоў шырокага профілю. Гэта стала неабходным у сувязі з новымі, больш высокімі патрабаваннямі да якасці прадукцыі, у тым ліку, што экспартуецца ў Расійскую Федэрацыю. Зараз вядзецца работа па стварэнню спецыяльнага ветэрынарна-санітарнага факультэта ў акадэміі (дзённай формы навучання). У ВНУ пакуль што вучацца 4,6 тысячы студэнтаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Малебен за беларускі народ

**У віцебскім Свята-Успенскім храме па серадах моладзь збіраецца на малебен за беларускі народ, які праводзіцца на беларускай мове.**

Як адзначылі ў віцебскім епархіяльным аддзеле па справах моладзі, на роднай мове размешчана інфармацыя аб маладзёжных справах епархіі і на спецыяльным сайце: www.carkva.info. Гісторыя беларускага хрысціянства ў Беларусі вывучаецца ўдзельнікамі праваслаўнага летніка «Дружба». Тут у ліку іншага праводзяць сярэдневяковыя касцюміраваныя балы, рыцарскія турніры. Гэты летнік штогод працуе кіламетраў за 16 ад Віцебска на беразе возера Бернскае. Тут адпачываюць дзеці не толькі з праваслаўных сем'яў.

Дарэчы, кошт пуцёвак сёлета складзе ўсяго 79,6 тысячы рублёў, а для сем'яў, дзе бацькі працуюць у бюджэтнай сферы, — 39,6 тысячы беларускіх рублёў. І гэта за знаходжанне на працягу 18 дзён, пяціразовае харчаванне экалагічна чыстымі прадуктамі айчыннай вытворчасці, магчымасць пакатацца на катамаранах. А самае галоўнае — лагер дае магчымасць шмат чаго новага распазнаць аб пытаннях рэлігіі, любові да блізкіх.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Слухай сваё

## «Базар» заспявае па-беларуску



**Сталі вядомыя імёны артыстаў, якія прадставяць Беларусь на конкурсе маладых выканаўцаў і дзіцячым музычным конкурсе на «Славянскім базары ў Віцебску-2007». На фінальным праслухоўванні, якое праходзіла ў Мінску, прафесійнае журы дало «дабро» Георгію Калдуну, Аніцы (сцэнічны псеўданім Ганны Тоўсцікавай), якія выступяць у «дарослай» катэгорыі, а таксама юным выканаўцам Андрэю Кунцу і Крысціне Святлічнай.**

Як расказаў «Звяздзе» галоўны спецыяліст упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Беларусі Алег Мазурын, першы тур абодвух адбораў — дзіцячага і дарослага — праходзіў непасрэдна ў Віцебску, куды прэтэндэнты дасылалі свае аўдыёзапісы. Другі і наступны адборачныя туры праходзілі ў Мінску падчас «жывых» праслухоўванняў. Да 2-га тура, які адбыўся ў лютым, журы, якое ў дзяцей узначальваў Васіль Раінчык, а ў дарослых выканаўцаў Міхаіл Фінберг, былі дапушчаны 11 і 14 артыстаў адпаведна. У 3-м туры ацэньваліся 3 маленькія і 4 дарослыя кандыдаты. У выніку права прадставіць Беларусь на Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе «Віцебск-2007» заваявалі 11-гадовы мазыранін Андрэй Кунец, на рахунку якога 2-е месца ў дзіцячым «Еўрабачанні-2007», і 8-гадовая Крысціна Святлічная, якая жыве ў Мінску і займаецца ў студыі «Каларыт» пад кіраўніцтвам Б. Асмалоўскага. У Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2007» гонар нашай краіны абароняць экс-вакалістка студыі Ірыны Дарафеевай, а зараз салістка Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі, 23-гадовая Аніка (Ганна Тоўсцікава) і ўдзельнік Тэатра песні Ірыны Дарафеевай, брат прадстаўніка Беларусі на «Еўрабачанні-2007» Георгій Калдун, якому 30 гадоў.



Дарэчы, ужо вядома, што Аніка прадставіць на XVI «Славянскім базары ў Віцебску» на суд міжнароднага журы песню «Вецер, абдымі». Георгій выбраў знакамітую мулявінскую «Малітву» і малавядомую песню беларускіх аўтараў «Дзве душы». Абедзве — на беларускай мове і, як сцвярджае сам спявак, вельмі падыходзяць яму па менталітэту. «Калі «Малітву» будуць параўноўваць з выканальніцкай манерай Мулявіна, то другая песня практычна нідзе не гучала, і яе можна будзе праспяваць з чыстага ліста, каб не было ніякіх паралеляў», — паведаміў выканаўца. Між іншым, пасля публікацыі ў адной з газет на Георгія пакрыўдзіўся аўтар «Малітвы» Алег Молчан, але пачуўшы падрыхтаваны варыянт, меркаванне перамяніў і выбар адобрыў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## «Уладар вёскі»: ад сяўбы і да жніва

**У Глыбоцкім раёне, які вядомы чытачам «Звязды» па шматлікіх экстрэмальных гульнях, што на працягу апошніх гадоў ладзіла мясцовая моладзь, распачалася падрыхтоўка да правядзення чарговага праекта пад назвай «Уладар вёскі». Яго арганізатарамі выступаюць маладзёжны цэнтр, райкам БРСМ і ўпраўленне сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама.**

